## З БЫЛОГА

Калі я нарадзіўся ў трыццаць шостым, пад восень, у мацеркі ўзнікла натуральнае пытанне, якое імя даць мне пры хрышчэнні ў нашай Пакроўскай царкве. Успомніла Сакраціка — свайго равесніка, сына настаўніцы ў бежанскай Смышляеўцы, што за Самараю. Святар аказаўся чалавекам культурным і пахваліў выбар. Потым, праз гады, і пропаведзь сказаў пра старажытнага Сакрата, чым незнарок выратаваў мяне ад пасмешак хлапчукоўства ў местачковых маіх Крынках Гарадзенскага павета. У радзіне клікалі: Крацё — калі спаважна, Крацік — калі па-сяброўску, Крацюнё — калі ласкальна, і Крат, Крот — калі хацела надакучыць мне хеўра. А, наогул, абавязковую па плебейскай звычцы празыўку насіў я — Котляр, бо быў тоўсты, падобны да пузатага даваеннага аптэкара Котляра.

Знявагі цярпеў я даволі пакорліва, удаўшыся ў крыклівых, але мала адважных бацькоў. Трымаўся збоч дзіцячае банды, якой верхаводзілі ў Сакольшчанскім закутку Крынак лёгкія на кулак браты Шамрухі з дапамогаю Патэжа і Галяка, паўсірот, якім не давалі рады іхныя маткі, пакінутыя гулякаватымі мужамі. Заўсёды спрабоўвалі пераняць ад іх уладу Ліс з Чаркесам, аднак бракавала ім тактыкі і колькаснай перавагі; усякая натуга на замах канчалася разбітымі насамі ды прымірэннем. Я надта баяўся відавоку крыві, а калі аднаго разу дастаў яшчэ і каменем у патыліцу, кінуў з імі хадзіць і завёў дружбу з непрылюдным Жоржыкам і яго сястрою Таняй з багатай хаты ў завыганскай Кальварыі. Ён прыйшоўся мне даспадобы сваёй ціхай падатлівасцяй і большай хваравекасцю. Адначасна, бываючы ў яго на панадворку і ў вялікім садзе, я меў гонар знацца з замажнейшымі за нас людзьмі. Малыя вельмі хваляцца ўласным родам, можа быць, мацней, чымсьці дарослыя.

Мае акцыі ў вачах Жоржыкавых родзічаў не былі нізкімі як сына рамеснай пары шаўца з краўчыхаю, а выраслі дзякуючы Курчу. Гэты святы сусед, які насіў бараду да грудзей ды нясціхана мармытаў малітвы, натхніўся той пропаведдзю “батюшки” і сасніў прарочы сон, што я буду праваслаўным айцом. Мая маці не была супроць такое перспектывы для мяне, але, як жанчына, рэалістычна заўважыла, што заіка я нясцерпны (па бацьку пайшоў, хоць і шок ад нямецкіх бомбаў у чэрвені сорак першага прыслужыўся ў тым нямала).

Словам, наканавана мне выключнасць, так сказаць, месіянства, нягледзячы на тое, што сам я найахвотней стаўся б Сяргеем, Юркам, Міхасём, Грышкам...

Пра само прозвішча “Яновіч” не чулася гаворкі. Я хадзіў у Яновічыках як сын, а бацьку Косцю ведалі Антошкам. Чаму? Меў ён дзеда Антона — можа прадзеда? — які праславіўся цяжорнымі аплявухамі сваім апанентам у карчме, таксама, буйным норавам (яго ніхто ніколі не пакаціў, ні ў чым не абдурыў). Валачашчы быў стары, тыднямі не вяртаўся дамоў,

а калі ўжо, нарэшце, дык сям’я не пасмела нават паказаць нейкае здзіўленне, не кажучы пра выгаворванне. Прабабуля дапусцілася б балеснае памылкі, наважыўшыся адшукваць яго ў жыдоўскіх забягалаўках; усе гаспадарскія турботы кладыся тады на ейныя плечы, вядома.

У сялян няма гісторыі. Веды пра радню адыходзілі ў магілу, пакідаючы паўфальклорны след у памяці нашчадкаў, пераважна ў выглядзе скандальных эпізодаў. Гэтаксама і ў нас. Я лепей любіў бабскія пераказы, у якіх знаходзіў крышынкі праўды аб мінулым жыцці (мяне страшэнна цікавіла, як гэта было даўней!). У мае няцэлыя дзесяць гадоў дажывала свой век татава матуля. Паншчыну яна не памятала, але ўсё згадвала аб вядомым ёй ад старэйшых за яе, што мусова было ў досвітак ісці ў двор на работу, цівун аб’язджаў хаціны, стукацеў чаранком бізуна ў сцены і крычаў: — Уставай! Тыя, хто разжыўся на свой кавалак поля, араў, сеяў і жаў на ім месячнымі

начамі. У нядзельку нельга было нічога рабіць, акрамя як памаліцца ў мужыцкай цэркаўцы, пакрытай саламянымі паркамі. Чакалі гэтага дня або іншага свята, каб адаспацца, даць адпачынак рукам і нагам, падгаіць раны ад няшчасных выпадкаў ці гайдукоўскіх нагаёў на панскім гумнішчы. Прыгоннае права адменена напрыканцы зімы 1861 года. Крынкаўскім халопам апавясціў аб тым святар, пасля багаслужбы. Стаяў высокі, ясны і цёплы дзянёк, зямля пазбывалася снегу, цурчэлі ручайкі; дзеўкі ішлі босымі, сёй-той з мужыкоў паскідалі лапці. Людкове плакалі ад радасці! Налез потым цёмнаю хмараю польскі “мяцеж”. З двара прыйшлі паночкі ў рагатых шапках ды ўзяліся забіраць дзецюкоў у паўстанне. Начальнік заеўся на маладога Чабана з Сакольскай вуліцы, які вельмі прасіўся пусціць яго дахаты. Калі ж усёй шайкай накіраваліся на астроўкаўскі фальварак, камандзер сказаў нудліваму Чабанчыку: — Пацалуй мяне ў халяву бота, то адпушчу цябе, душа ты нявольніцкая!

Не толькі ён рынуўся абцалоўваць... Мяцежнікаў, што палавілі былі казакі ў гушчавіне Перацёсаў, прыгналі ў Крынкі і павешалі на Шубельніцы, гары каля праваслаўных — раней уніяцкіх — могілак. Тамака целяпаліся яны досыць доўга ў вяроўчыных петлях, бо ў халадэчу не загнівалі. Дзе іх пасля хавалі, адзін Бог ведае.

Яновічы папраўдзе заінтрыгавалі мяне ў сталым узросце, але няшмат уведаў. Столькі ўсяго напачатак, што канчатак

“-іч” ёсць баярскага паходжання. Затым, акрамя вёсачкі Яновічы пад Беластокам ды мястэчка Яновічы за Віцебскам, важныя Яновічы сеялі пограз у Коўні за часам Вялікага княства Літоўскага. Якісьці Яновіч арганізоўваў у царскай Варшаве падпольную партыю “Пралетарыят” (польскі рабочы рух анімавалі, пераважна, інтэлігентныя шляхцюкі, што зараблялі па фабрыках на кавалак хлеба сабе, калі абарвалася ім паншчынная дарэмшчына). Узрадавала мяне кніжка Кастуся Тарасава “Память о легендах”, на якую наткнуўся я ў

лонданскай Скарынінцы: з гвалтам на цэлы Наваградак сварыліся з Міцкевічамі за спадчыну тамашнія Яновічы, неадступна і працягла, што праўдападобна і паслужыла славутаму Адаму матывам судовае цяганіны ў эпапеі “Пан Тадэвуш”.

Мяркуючы па марфалогіі прозвішча і напрамках ягонага распаўсюджання, вынырнулі мы недзе ад шведска-нямецкае Рыгі, ад Янаў курляндскіх; не падваршаўскіх, што падказваюць польскія мае сябрукі, відаць, разлічваючы на абуджэнне міфічнага “клічу крыві”... Праваслаўнае веравызнанне ў курную кучу Антошкаў, што асядала ў зямлю ля азярышча, збоч ад уезду ў Сакольскую, заявілася — як разумею — выпадкам: дзеда не было каму хрысціць у касцёле, ксёндз ублытаўся ў “мяцеж”. Антошка слушна тады рок: “Бог усім той самы, нясі дзіця бацечку!”

Да сённяшняга часу, аднак жа, рэдка ўпаткаеш некаталіцкага Яновіча. Было б наадварот, калі б вывеліся яны не з прыбалтыйскага староння, а, скажам, з Чорнае або Белае Русі.

Затое, цалкам зразумелая генеалогія ў маёй маці, Алесі Грычанкі. Яе татуля, Іван Грыка, выйшаў з ляснога Язафова, а жыў у блізкіх Навасёлках, дзе прадаў участак зямлі і за чатыры тысячы рублёў купіў каля 1910 г. дванаццацігектарны арэал па другі бок пушчы, у Барсуковіне, што блізу колішняга свідзілаўскага двара; перавёз хату. Грыка ёсць грыка, што тут няяснае?

Губляюся ў доследах як матчынага, так і бацькавага каранёўя. Ашаламляе безліч сясцёр і братоў, родных і дваюрадных, цётак і дзядзькоў. Радзіна з пятнаццаці душ не здавалася завялікаю. Выходзілі замуж, жаніліся, і зноў паўтаралі тую ж мнагадзетнасць. Куды яны падзяваліся і дзе знаходзілі месца сабе пад сонцам?! Шмат памірала ў дзяцінстве і маладосці, амаль палова, тым не менш кладавіліся спаць покатам, адно каля аднаго на адабранай з акалотаў жытнёвай

саломе, накрыўшыся чым папала; бліжэй печы ляжалі хварэйшыя. Галава сям'і сядаў за стол есці першы, а матачка пільнавала, каб не перашкаджала яму дзятва. Яго слова слухалі ў абсалютнай цішыні, нікому і ў галаву не прыходзіла не выканаць сказанае. Смерць малога раздражняла, адцягвала назаўтра заканчэнне нейкае работы ў полі або ў стадоле, хляве...

Маленства — як і ў кожнага — не ўспамінаецца мне хаця б прыблізным імгненнем. У чацверты гадок нешта ўжо адклалася ў памяці, замглёныя два-тры вобразы. Грукацелі па бруку савецкія танкі. На якімсьці з іх стаяў, высунуты па пояс з гарматнае вежы, рассмяяны танкіст, спрытна ловячы жмуты кветак, шко кідалі яму жанчыны. Гэта з верасня трыццаць дзевятага, калі ў бабіна лета прападала Польшча. І ў тую ж снежную зіму залазіў я ў валёнках ды палітэчку на роўныя з платамі грумакі каля Антыфонаў, куды збягаліся хлопчыкі, каб на самаробных лыжах са штыкетаў з'язджаць уніз, да студні Булавы, з якое чэрпалі ваду паненкі, павіскваючы ад залётаў кавалераў: шпурлялі намочанымі снежкамі, цэлячыся ў лыткі. Такога белавею болей я не бачыў. Шаша на Саколку, да чыгуначнай станцыі, нагадвала сабою ўмерзлую ў высозных берагах рэчку; штораз раскопвалі навеіны. Вуркаталі грузавічкі, механіку якіх я не ў стане цяпер растлумачыць: паабапал задняе сценкі іхных шафёрскіх кабінаў капцілі жалезныя печы, у якія дакідалі невялікія палены. Нешта накшталт самавараў... У адліжны яшчэ зазімак мацерка звадзіла мяне ў гандлёвыя рады; купіла цацку, зялёны самаходзік з праўдзівымі гумовымі калёсікамі, і я нёс яго, засланяючы далонькай ад хуткіх і мокрых сняжынак. Нагуляўшыся ім, растрыбушыў яго на часткі, дабраўшыся да таемнага нутра... Цукеркі-ляндрынкі, што за бясцань выдзялялі саветы для тых, у каго былі малыя дзеці, схавала бабуся ў карзіне на запечку, а я прыкінуўся нічога не ведаючым пра гэта.

Стала на кватэру да нас смяшлівая саветка Аня, рыжавалосая настаўніца, што і з'явілася маім дзівосным сутыкненнем з чужаземным прыезджым; польскае мовы я не цяміў, а расейскую — не царкоўную — пяршуткі раз счуў. Не кеміў я таго таксама, што, не адыходзячыся далей ад дома, апынуўся ў суседняй дзяржаве, і то якой (!), ажно да Японіі... Я тых круглатварых недаросткаў разглядаў на ілюстрацыі ў якімсьці чытанкавым апавяданнейку пра пераможную бітву з імі сталінскіх салдатаў ля возера Хасан, што блізу мурашынага Кітая. Але, яшчэ да гэтае маёй прасветы, занадзіўся хадзіць да кватаранткі ейны калега па педагагічнай рабоце ў крынкаўскай школе, па прозвішчу Шатэрнік. Як і яна, "васточнік". Па закону кантрасту, гэты суровы брунет у акулярах упадабаў на маю бяду вясёлую ды культурную панну з адпавядаючай яму расейскай натураю. Відавочна дзеля шаноўнага прыліку запаліўся ён прынагодна ліквідаваць маю першаварварскую непісьменнасць, падцывілізаваць гойсаючага засранца. Як толькі пераступаў ён парог з сяней у хату, у мяне адразу сыпаліся на шчокі слёзы: трывожылі ягоныя колкія вочы, мала зразумелая маскальшчына, матчыныя наганяі мне, урэшце. Зубрыў верш "Хлопчык і лётчык"; над ім аціхаў.

Гадаваўся паўсіратою. Бацька адбываў няволю ў немцаў, трапіўшы ў палон да іх дзесьці пад Чанстаховаю, пагнаны палякамі на вайну. Мабілізаваны ў конную артылерыю, малавеле не аддаў Богу душу за працяглае супраціўленне ягонай дывізіі, званай ці не літоўска-беларускаю; шпарыла яна па гергачах да апошняга снарада, а напаследак і з шаблямі ўсяго пайшла ў атаку, за што пасля, акружаных і раззброеных, расстрэльвалі фрыцы кожнага дзесятага ў шарэнзе (па ўзору старажытнарымскіх легіёнаў, якімі хваліліся ў Германіі). Параненых прабівалі нямчугі штыхамі, рагочучы на ўсю ляпу. Некаторыя, лежачы здаровымі ў акопах, прыкінуліся мёртвымі; бахалі з карабінаў ім у патыліцы, каб пераканацца, ці сапраўды, дык падкідвала імі ад кулі на паўметра.

Настала лета саракавога года і мацерка з бабусяю Палосяю — разадзеўшы мяне пад панка — павялі да фатографа, што трымаў атэлье каля рынку. Патрэба ў тым вынікала вялікая; бацька прыслаў з Саксоніі ліст, пытаючы, як сыночак маецца... Я яго не запамятаў, хоць, казалі, вішчаў і абдымаў яго за шыю, калі забіралі на польска-нямецкі фронт; адчапіўся ў цукерніка. Той лямант вярнуўся да слыху і пачуццяў пазней, у разаспаную лютаўскую ноч: прыехалі энкавэдзісты вывозіць у Сібір суседку з малымі, Лёльку Яновічыху (яе чалавек сеў быў у беластоцкую турму, на сваё шчасце, і так ён у ёй датрываў да збавеннага для яго чэрвеня сорак першага).

У маё немаўляцтва ўсе запакутавалі са мною. Ужо нарадзіны даліся матцы ненатуральна цяжка. Ведаю з яе смутных згадак, што душылі мяне хваробы, у іх ліку і “ангельская”. Да “дахтароў” дарагіх падавалася. Мелі абое за што, шаўцуючы ды краўцуючы, седзячы ўдадатак на некалькіх гектарах ворнае зямлі. Ліхоцці тыя прыбіліся да мяне якраз тады, калі згарэла Антошкава хаціна; з пажару вынеслі мяне ў калысцы. Пагарэльства ў даваенны час давала неблагое збаўленне ад неласкавага лёсу: даплюсаваўшы страхоўку сваім запасікам або скромнаю пазыкаю мажліва было нязгорш перабудавацца. Двум братам, менавіта Косцю і Грышу, было цесна пад адною страхою. Брацiха Манька з Азяранаў, з расейскімі паперамі акушэркі, перавышала інтэлігентнасцю Янавічоўскі род, а пайшоўшы замуж старою дзеўкаю, пераважала гаспадыньскай заядласцю. Яна і дадумалася падпаліць, у нікога не пытаючы, павязаўшы перш падручнае дабро ў вузлы; апланаваўшы ўсенька да дробязей, не патраціла нават гаршкоў. Убачыўшы блізкі агонь скеміў свой шанц і хітры Сяргей Яновіч, сын брата майго дзеда, які жыў са сваёй Лёлькаю зусім як у хляве. Запалыхала на Янавічоўшчыне, што і пажарнікам не было чаго рабіць! Неўзабаве закрасавалі тут прыстойныя дамкі, двухпакаёвыя, з асобнымі кухнямі, з ганкамі; наш — куплены ў Служках, дзядзькаў — набыты ў

прарока Ільі Грыбаўскага, які, зняверыўшыся ў сваіх сектантах, распрадаваў святы горад Вершалін, заснаваны ім каля лішчанскіх хутароў.

Не раз запальвалі нада мною грамнічную свечку смерці. Не сканаў, хоць здавалася: няма надзеі... Заплакваліся. Есці — не елі. Усякая праца не клеілася, работа з рук падала. Дзе які заробак на лекі прасадзілі. Адратавалі! Ці бо арганізм перамог... Пэўна ж, адно і другое. З худзінкі пераўтварыўся я ў абжору, у скваркаеда. З двухгадовым спазненнем узяўся станавіцца на ногі, па рахітычнаму крывыя і слабенькія. А тое, што значыць ваенная завіруха спазнаў я не пры саветах з іхным самаходзікам ды ляндрынкамі, хаця і з Шатэрнікам, і пярэпалахамі поначы ад якогасьці дамавіковага НКВД, але ў пераджніўны надыход расхлістаных у гарачынь гергетуноў са свастыкай на спражках шырозных дзягаў. Мястэчка бамбілі аэрапланы з гэтай кпінаю крыжа на крылах; успалымнелі гарбарні на Пагулянцы, валіліся муры на Каўказскай, іскрыліся галавешкамі крóквы на банку, пошце; жыды гевалцілі, мітусіліся. Хрысціянскія ўскраіны стаіліся, як тыя куры ў крапіве. З дваровага старадрэўя распаўзліся кузакамі чырвоназорныя танкеткі, за якімі ганяліся шулякамі нямецкія знішчальнікі. Маці ўцякала са мною жытамі на Барсуковіну, у родны ёй засценак. У Айнавых горах, што за маёнткам пана дэ Вір’яна, не дазваляў нам падняцца з прымежку начэплівы самалёціска: нізка стракацеў па голагаловых “чубарыках”, што разбягаліся ў палеткі. Засланяла мяне сабою, галосячы па-бабску. У дзядзькоў — дабрылі мы ўрэшце — пад Крынскай пушчаю ўлеглася ціш, кружылі галаву ўстаялыя пахі пчалінага ліпеня. Аднекуль далятаді выбухі і, час ад часу, страляніна, усё роўна бы нехта ляскатаў кійком па прыдарожным паркане... Завіталі чужыя ваяры і сюды, на ўсё адказваючы “гут”; упалоханай Грычысе растлумачыўшы: “Ны пляч, матко, за цвай тыдэнь будзем ф Москаў!”

Паставіўшы прычэпу з паходнай кухняй на падворышчы ды закамандаваўшы бабам напрыносіць ім “шпэк-яйкі-куры”, парассядаліся хто куды галіцца. Плёхкаліся ля калодзежа, вычаўпаючы, бы падшпаркі над рэчкаю; участавалі мяне кавалачкам шакаладкі, пагладзілі па віхры: “Гут, малі зольдатэн! Ніхт бальшэвік”. У варотах на гасцінец заззяла постаць камандзіра ў блішчастых ботах і ў настабурчанай шапцы: павеяла погразам. — Ахтунг!

Людзі ў нас, гаворачы пра каторую ўладу, заўсёды пужаліся яе. Адзіная, якую прынялі былі спачатку за сваю, гэта савецкая. Месяц-два трактавалі сталінскае начальства, здаралася, з непрыхаванымі пажартункамі; хадзіла ж яно ў трантах, галотнае і галоднае, непадобнае на важнае; парабкі па гаспадарох акуратней швэндаліся ў святы. Мужык не шануе таго, у каго няпанскі выгляд. Праўда, амцкамісар у Крынках апранаўся даволі марна ў параўнанні з палячыкаватым бурмістрам за Пілсудскім, але цанілі яго мацней, як ні парадаксальна. Гэты новапаселены дойчман выязджаў брычкаю глядзець ураджаі; багатырам загадаў успамагаць задарма канём і плугам малазямельных і салдатак; не гідзіўся зайсці ў занядбаны хлевіска, да рохкаючых “швайнэн”. І тут жа выконваў акт справядлівасці: надаваў кульбакаю ўкаплех сялянскім вашаям, ажно юшкаю абліваліся. Цікавіўся сямейным сужыццём: калі хто біў жонку, не дапусці Божа, цяжарную пры гэтым, дык гнаў буяна выносіць на двор лаву, лягаць на яе з аголеным задам; хапаў пугу, што стырчма целяпалася на перадку ягонае брычкі, мачыў рэмень у карыце ля студні на ваду жывіне, кумячыў; свістаў ёю ў паветры, каб лепей дапасаваць да далоні і прымаўся пісаць ёю на скуры дуралоба: “айн-цвай-драй...” Называлася тое ў народзе караю да першага ўсёру. Жанкі не надта пратэставалі, а плакалі болей для людскіх вачэй. “Ті ны ест чэлёвэк, ті ест шайс!” — чуваць было ягоную нязменную сентэнцыю.

І мужчыны наракалі неяк няўпэўнена, бо і супроць чаго? Скідалі шапкі нядотыкам таксама перад жандарам Шатэнбергам, у адлегласці заказаных ім дзесяці крокаў. Але яго так не паважалі, быў ён невядома нашто: юдзеяў пазаганялі ў гета і нікуды яны не паказваліся, а партызанаў пакуль што не накідалі самалётамі з Масквы. Шатэнберг мацюгаўся ад рання да змяркання, шукаючы зачэпкі. Ад няма чаго рабіць, шпарыў разлезу ў морду за павалены плот; кагосьці — за непабрукаваны падворак або за дзіравы дах, за абгноенага ці ахвачанага каняку, за непабелены комін, непамаляваны франтон. Крынкі папрыгажэлі. За абадранае дзіця выклікаў радзіцельку, ківаў ёй кулачыскам, маўляючы на мазурскім дыялекце: “Ма ему быч чісто, ногы выміты, обуты, лята на дюр, глёва бэз робак, чэсані на бок яко фюрэр, пазногхцэн абчаханы, уші бэз мюд; гут, ё-ё, ма ны шмэрджэч, вэсолё очі, кшёнчка нымэцка ф длёні... Тын малі ест райхсдойч, нымэц, ё-ё, ті его руска мачь, ті ма зробыч гут юні-нэмчу, фарштэйн?!”

Цішком штурханыя маладзіцы бараніліся: “Скажу немцу!” Пераня́лі гэту моду і малпаватыя дзяцюгі, бачачы, як ад іхных няўрымслівых учынкаў свярбіць бацькава рука.

Акупацыйнае дзяцінства прамінала ад траўмы да траўмы; у нечым інваліднае. Маці знемагалася ад навалы турботаў. Бабуся Палося выручала яе, у чым была змога, прыгаворваючы сабе: “Божа ты мой, Божа, і чаму гэта так доўга я жыву?!” Я абіваўся між імі з комплексам дармаеда, грэшна падкага на смакату. Недзе з Дрэздэна прыходзілі пісьмы ад таты, пісаныя беларуска-польска-нямецкім слэнгам. Пісьманосцаў пошта не наймала, але лісты прыносіў адзін з былых; даставаў ён за гэта пару яек, акраец бохана; ад замажнейшых жа то і скрыгель саланіны. Матуля спачатку бралася чытаць сама татулевы крамзолі, пераадольваючы нават польскія славесы (служыла ж некалі ў Беластоку!), але ўжо безвынікова мэнчыла нямеччыну, нягледзячы на некаторае веданне жыдоўскае гамонкі, якою шумелі нядаўнія Крынкі. Хочаш не хочаш, запіхвала канвэрту

за пазуху, завязвала ў ручнічок кус мяса і церабіла да Харужага, што крыцаю сядзеў за прасторным пісьмовым сталом у непрапарцыянальна маленечкай дамоўцы з ледзь бліскаючымі ваконцамі ўверсе вуліцы, недалёка ад руіны кузні Лейзара. Старакавалеруючы кніжнік жыў з таго, што пісаў па-нямецку патрэбныя паперы; фармальна наша старонне далучана да Наваўсходніх Прусаў і лічыліся мы ў Рэйху нібыта.

Весткі ад бацькі акрылялі перш за ўсё ў катэгорыях карысці. Яго як беларуса вызвалілі з лагера для польскіх ваеннапалонных, адпаролі з грудзей латку з лацінскай літарай "пэ" і прызначылі на вольную працу ў абутковай майстэрні з правам на плату, праводжанне водпускаў (на тэрыторыі Нямеччыны). Стаўшы такім чынам гастарбайтэрам дасылаў нам час-часам грашовыя пераводы, сціплыя, але не настолькі, каб не вярнуўся ў маю бабскую сямейку аптымізм, вера, што не ўпаткае нас бясхлебіца і панурае беспрасвецце. На дасыланых ім фотках паказвалі мне нябачанага мною дзядзьку з гальштукам, у гладкім гарнітуры, выгаленага, з папяроскаю ў зубах, у блісклівых ад ваксы туфлях; у таварыстве капялюшніка ў плашчы ды з кульбакаю. Так, здаецца, і пахацела ад іх парфумамі, ад тых ягамосцяў ні ў чым не падобных да крынкаўскіх мужыкоў з парэпанымі ад бруду рукамі, у абшмальцаваных лахманах; прыгорбленых натруджанасцю, маючых кантакт з брытваю напрыканцы тыдня, не падазраючых існавання зубное пасты, шчотачак...

Маці казала: "Гэта твой папа". Я не пагаджаўся: "Не хачу яго!" — і ўмомант атрымліваў аплявушку. Усчынаўся агульны енкат: мой, бо набілі; матулін — чаму я такі тупы; бабулін жа нагадваў стогн (яна ўяўлялася мне жывым анёлам дабрыні, я хаваўся за яе, калі пагражала лупцоўка).

Мой прыяцель Жоржык быў усё ж нудою хадзячаю і я, іншы раз, бег у большую кампанію Шамруховых сяброў. Мяне, заіку, на жаль, не надта прымалі яны да сябе, выробляючы нада мною кепікі. Рос я фізічна непаваротлівым, прытым

каратканогім, няздатным залезці латашыць яблыкі ў садаўнічага або налавіць вераб'ёў у падстрэшках асенніх гумнаў, каб потым шпурляць імі ў расчыненую фортку Чабановага акна, за якім вечарамі рэзаліся ў карты гулякі, а найспрытней Гаян з Чаркесам.

Аднойчы, гуляючы самаробным самалёцікам на канцавым выгане з крынічкамі прыкмеціў я фурманку свайго барсуковінскага хрышчонага, як сунулася край рова, якім сцякала іржавая вада з колішняга азярышча; уехала сюды з трактовае касцельнай вуліцы, везучы чыстага і не па-нашаму апранутага незнаёмца, чарнявага і з чубастай падстрыжкаю. Я бегма кінуўся папярэдзіць пра гэтае дзіва маці. Яна выйшла за мною спатыкаць — і залямантавала! Так я ўгледзеў роднага татку; з перапуду зашыўся ці не пад ложак, адкуль вывалакалі мяне за калошыны, а я адбіваўся, дзёрся. Насыходзілася сваякоў: гоман, прыгар ад смажаніны, позван чарак. У румянасці клёнаў у перадвосень сорак трэцяга?

Стары паспадзяваўся на ўласны нямецка-беларускі "аўсвайс" ды "урляўбкарту" ў кішэні; нядоўга цешыўся свабодаю, выбралася наведаць яго мясцовая хільфспаліцай з аўчаркаю. Звочыў іх запозна, паспеў адно затаіцца пад тым жа ложкам. Як сёння бачу валахатага сабарна: рвецца туды, калабарант Чарнецкі не пускае прывязі, гергечучы нешта шэфу, што чарапкаўся з рэвальверам у руцэ з гарышча, дзе быў пазаглядваў у схоўны балаган. Выходзячы, ён пераклаў нам: — Трэба, каб заявіўся ў камендатуры і нічога яму не будзе.

Ага, вер ім.

У тую аблаву — раней у страхотныя рэвізіі — яшчэ не прызнаў дарэшты бацьку. Дайшло да гэтага пасля, калі ён ужо хаваўся ад немцаў і толькі поцемкамі прыходзіў паесці, абмыцца. Я надзвычайна любіў перамалёўваць карцінкі з кніжак; сам азваўся да яго, і то з просьбаю: "Папа, намалюй мне пташку". Ён у адказ як бы прытуліў мяне, моўчкі ўзяў працягнуты яму аловак і, можа быць, упершыню рысаваў,

загаварыўшы пацяплелым голасам: “Ну, мне няма калі”. Устаў, зашпіліў кажух, нырнуў у густую за дзвярыма цемень. Маці не зразумела хвілі: ападыктычная, што ні дзень нездаволеная. Узгадаваная ў настроі тых калябарсуковінскіх хутароў-калоніяў, на якіх гаспадарылі скінутыя пілсудчыкамі з сёдлаў правінцыяльнае кар’еры пострасейскія разначынцы. Беспардонна спугнутыя, нават з цалкам мізэрных пасадаў яны карысталіся ў грамадстве свежай памяццю сваёй важнасці. Дастойныя ў ваколлі, з гімназійнымі атэстатамі, начытаныя, крыху французскамоўныя; у царкоўны фэст шыкоўна балюючыя ў садках ці на верандах у вішнях і півонях, прыводзяць яны цяпер наўспамін палотны Сезана, эфірныя туалеты дам і мадэмуазель, выхаванасць масье. Асколкі ад раструшчанае імперыі. Але і кранутыя ў дваццатыя гады ідэяй Беларусі. Ад іх будучая мая мацерка ўбіла сабе ў галаву слоўца “папа́”. Побач з цудакаватым “Сакрат” паслужыла яно мне імунітэтам на чысцейшае... На нядобрае падпанства, лёгкую ў малалетка безумоўную лепшасць.

Арыштавалі ўночы. Расчынілі дзверы ў хлеў, задралі галовы на вышкі і наказалі: “Вылазь, Яновіч, ведаем, што ты тут!” Маці занесла назаўтра каменданту слоік мёду, кумпяк, пірагі. Не аднекваўся. Дазволіў, захабораны, пабачыцца ёй з ім у камеры, і пацешыў: адашлем яго туды, адкуль прыехаў.

Бездакорна працавала нямецкая машынерыя парадку ды ладу. Дрэздэнскі майстар адчапіўся быў пісаць да нас, куды кануў спраўны яго работнік “Коштусь”... Крымінальны вышук беспраблемна гэта ўдакладніў, маючы справу з прасцецкім, як ні казаць, уцекачом. Бацька, магчыма, не рызыкнуў бы зрабіцца мышкаю паліцэйскаму кату́, калі б фабрыкант у Саксоніі, упадабаўшы яго, не надумаў учыніць з гэтага кемлівага ва ўсім беларуса сваім спадчыннікам, бо замест сына Бог спаслаў яму дачку, а гешэфту патрэбны ж мужчынскі розум ды фахманства. У партызаны за недалёкімі ляскамі, таксама, не мог падацца, бо іх пакуль амаль не было, а тыя,

што паяўляліся ў вёсках апоўначы, аказваліся маскалямі або правакатарскімі ўласаўцамі на паслугах беластоцкага гестапа. Зрэшты, наваяваўся, адхацелася карабіна за плячыма і шаблі на баку; нацярпеўся холаду, голаду і вошай. Армія добрая кавалерам і валакітам, але не чалавеку, які ўсур'ёз думае пра сябе і звязаных з ім блізкіх асоб.

Тым часам фронт каціўся назад з бясконцае Расіі. У бульбе за стадолаю небяспечна валяўся пачак афішак, абы-як вываленых уночы з савецкага самалёта, відаць, з таго, што надоечы буяў недзе па-над Чортавым Балотам. Наўзбоч ад азерца Бяздонніца каля Астроўка ўпаў бамбавоз люфтвафэ, падбіты — пляткавалі ў Крынках — над Смаленскам, горадам, наконт якога спрачаліся: за Масквою ён ці перад? У Азяранах і ў Крушынянах юнакі пабралі ў камендатуры вінтоўкі: вартаваць мясцовасць ад рабаўнікоў і партызанскіх саланіннікаў. Шатэнберг паклаў па сабе вушы. Украінская рота, раскватараваная ў пасляжыдоўскай школе, штораз спявала пад п'яны гумар; ніхто не праходзіў па тратуары побач іх, асабліва дзяўчаты і маладзіцы, счуўшы дух раскілзаных жарабцоў. З'явіліся тылавыя вайскова-гаспадарчыя часці. У павятовай Саколцы строілі вермахту паношаныя ім у акопах чаравікі (што і збавіла майго татулю ад адпраўкі над Эльбу). Дазналіся мы, нарэшце, калі маюцца весці яго туды, на станцыю, трыццаць кіламетраў; начэквалі. Імгненне назаўжды — зарослы, бы злачынец, з позванам кайданоў, у этапе арыштантаў; маці утрупянелая; бабуля з перадачаю вязню прарываецца між сабак і паліцаяў, ёй ужо ўсё роўна... А ў святую нядзельку вярнуўся ён, як з таго свету, змардаваны, але яснеючы шчаслівасцю ўваччу. І з навінаю: "У Саколцы паставілі старажаваць нас аднаго паляка. Цераз яго я і дастаўся ў прыфрантавую майстэрню; бралі шаўцоў, азначылі кожнаму дарэмшчынныя нормы і свабодныя суткі за дабрахуткае выкананне. Ахвотна ўзялі мяне, бо спатрэбіўся ім нехта з нямецкай моваю і каб умеў растлумачыць іншым работу на фабрычных машынах".

Зніштажаюць вучаных або палітыканаў, а фаховістых — не. Куродымам снаваўся культ стала і кашалька. Мяне паслалі прывучвацца сяк-так чытаць і пісаць па-польску, бо цішком стала вядома, што Сталін дамовіўся з Англіяй і Амерыкай... вярнуць Крынкі пад Польшчу! Урокі адбываліся потайна ў сінім доме пані, апошнім злева, не даходзячы да мастка за Кузьмоваю мураванкай. Столькі пакаёвых кветак, як у яе, я дагэтуль не бачыў. Узвычаілі мяне за адным махам і разбувацца ў перадпакоі, мець свае тэпці на ногі. Гэта быў працілеглы майму свет. І таму, калі ўзімку на сорак чацверты выявілася канкурэнтная школка ў хаце Монькі ля той жа Гродзенскай, вуліцы крынкаўскай інтэлігенцыі, я выенчыў у бацькоў перанакіраванне мяне туды менавіта. Ад сяброў даведаўся, што тамака вальней і без панства.

Падпольнае навучанне магло закончыцца куляю ў лоб яго ініцыятару, а бацькам вучняў прымусовымі работамі, у лепшым выпадку руйнуючым захаборваннем жандара. У тую пару, аднак, акупанты неяк мякчэлі... Дзятве казытліва спадабалася насіцца з тайніцаю; дзяўчынкі і хлопчыкі гулялі бандкамі, шышыкаючы. У самотнае Монькі сталі на кватэру два расіякі. Смешна ламаліся ім языкі над знесенымі намі беларускімі падручнікамі з абачліва павырыванымі партрэтамі “сталінкаў”, розных камісараў з медалямі ў рад, бы святыя на іканастасе. У тым, што хвацкіх маладзёнаў падаслалі ў мястэчка дзеля здабычы харчоў у лес, цікаўліва здагадваліся нават мы, смургелі сямігадовыя; выдавала іх не наша мова, нетутэйшыя норавы, паводзіны, што проста скураю адчувалася: мешаніна бяздомнага бесклапоцця, гультаяватай весялосці, абыякавасці да адзення, неакуратнасці побыту. Полька, было, ставіла і двойку ў кает; савецюкі ж ні трохі не шкадавалі пяцёрак, і то з кропкамі! Пахваліўшыся гэтым у хаце, я з крыўдай прыкмячаў, як старыя горка ўсміхаліся, кажучы: “Якія яны вучыцелі, смаркатню разбэсцяць!”

Не было завельмі спадзяванняў на паляпшэнне будучага. Немец і савет аднае галіны вартыя. Адзін страляе, другі вывозіць у Сібір на марознае кананне. І той, і той за абы-што! Англія з Амерыкай далёка за морам і нашто ім патрэбна наша гора?! Армія Краёвая паўстае супроць Гітлера і Сталіна, ну, як гэта палякі, скачуць на сваю пагібель. Беларусам заставаўся інстынкт самазахавання, дбайнасць пра поўную кішку і кажух на плечы. У абцугах двух моцных даводзілася, бы мышам у норах, калі над імі клубуюць кот з кошкаю... У ранішнюю роснасць грымела ад Ваўкавыска артылерыйскімі залпамі. Злосныя, як шэршні, кубанскія і донскія казакі выкошвалі зялёныя аўсы на фураж сваім верхавікам. Іх нецярплівыя, порсткія характарам жанкі матлашылі загуменныя агароды, распальваючы агнішчы ў абваленых ямах на бульбу пад Глінішчам на Доўгім выгане. Франтавая каманда на чале з буславатым афіцэрам абвясціла мабілізацыю дарослага насельніцтва на капанне траншэяў у семяноўскіх горках. Пайшлі адны кабеты, пабраўшы рыдлёўкі і сухі харч з бутэлькаю малака або калодзежнае вадзіцы; мужчыны шмыганулі з дзецярнёю ў каменныя скляпы, парослыя малінамі і заслоненыя буяючым чорным бэзам. Няшмат накапаліся: бравурныя аўтаматчыкі абыходзілі вермахтаўцаў у фланк, пастрэльваючы ўжо з надрэчных зарасляў ля падкрынкаўскіх старых млыноў. Немец гыркнуў: “цурык, фраў!”, шлёнскі яго перакладчык раздаў ім талоны на кіло цукру, якія рэалізаваў у мястэчку гефрэйтар як кладаўшчык прадуктовых запасаў. Калі каторая пырскала перад ім слязьмі, што сямейка аслабела ад сахарыны, падсоўваў такой дадатковую ўпакоўку, прымаўляючы: “Бер, бабо”.

Маці з бацькам падзяліліся ролямі на час пераходу фронту: яна, узяўшы мяне за руку з сабою, уцякла да сваіх братоў у падлессі, пакінуўшы яго з цешчай даглядаць сядзібу. Да Барсуковіны вайна яшчэ не наблізілася. Аднак, не чакаючы, запраглі там буланага ў воз з раскладзінамі, навыносілі пасцелі і

хатулёў ды, прывязаўшы да клініцаў дойныя каровы, парыпаліся няспешна за Барсуковую гару, наўзбоч ад леснічанскага Сасновіка, на пясчаны груд каля трансаваў Чортавае Хаты. Устаялася спякотнае пагоддзе і я не быў супроць таго, каб пабыць у тых будах, укрытых яловымі лапкамі, да самога сканчэння жніўнае гарачкі. Хоць ты качайся ў чарніцах, да адрыжкі аб'ядайся пахкімі малінамі, варочай на цыганскай патэльні смажаніну з грыбоў, выцягвай з-пад камянёўя ў рачулцы слізкіх мянтузікаў; рай першабытнаму чалавекападобенцу, калі сонца грэе проста ў цемя (камароў адганяла ў спаннё дзёгцевая мазь, злёгку нашмараваная на твар і шыю, якую змывалі ў рань халодным глеем з прыбярэжнага дна). Варочаліся з абходу ваколіцы дзядзькі, паведамляючы, што нямецкія ўкраінцы паляць Астравы, чыняць збыткі над сялянкамі, вывальваюць з куфраў дабро, забіраюць гаспадароў з фурманкамі ў адступаючы абоз. У залацісты захад бзыкнула ля вушэй чмялём блуклівая куля і засела пад карою таўшчэзнае сасновае крывулі. Аднекуль вынырнуў на закусцелы лужок конны патруль, быццам апісаныя ў кніжках крыжакі ў даўніну, што валачыліся ў пошуках нехрыстаў... Займалі быдла, далучаючы да вярстовага статку на Талькоўшчанскім гасцінцы на Беласток, у армейскія бойні. І, як на заказ, засакатала ў багонніку руская пэпэша, не ў жарт упалохаўшы рэквізітараў: зніклі нам з відавоку шпарчэй, чым мы паспелі і словам абмовіцца. Агонь дзеля ежы палілі ў полудзень, нясмольным сухападам паміж угусцелымі ялінамі, каб дым не валіў слупам увысь. Запрыходзілі да нашае стаянкі чуйныя партызаны. Цёткі частавалі няпрошаных гасцей нагрэтаю стравай і смятаністым сырадоем. Ім прыеліся рыбныя кансервы, якімі падкармлівала сваіх дыверсантаў база на “вялікай зямлі”. Паласаваўся баначкай селядцоў і я, ад незвычайнасці першасмаку якое ўсё спадзяваўся наступнае, але камісар у скураной куртцы і з чырвонай зоркаю на круглай шапцы, абдорыўшы мяне, чамусьці больш не паявіўся.

Крынкам нядобра шанцавала на ўсходні мілітарызм. Дастаткова было з'явіцца тут расейскамоўнай уладзе, як адразу за ёю ішлі калісьці белакашулістыя батальёны, потым бальшавіцкія садысты, за трэцім заходам напрыязджала танкаў і насядала на польнай роўнядзі баявых самалёціскаў. Так і цяпер, калі нямчуры драпалі ад Івана без аглядкі ў свой Берлін. За дваровымі ліпамі, што памяталі Кацярыну ІІ, пыльна прызямліліся транспартныя "дуглясы"; цішэў рой "істрабіцеляў", раз'язджаючыся, задраўшы хвасты, пад рахавіцкі фальварак і могліцы астраўлянаў. У былой прыцаркоўнай за царом школе асталявалася сталоўка для лётчыкаў, а іх саміх — зграбных і залётных — рассялілі ў абавязкова нятлумныя сем'і. Так складвалася, што найпераважна да маладых удоваў або салдатак, што мела свой дзівосны скутак. Калі эскадрылля падымалася з аэрадрома ў паветра ляцець бамбіць Варшаву або Кёнігсберг, перш паварочвала на мястэчка, разлятаючыся над ім хто куды. Ад нізкага рыку матораў адпадаў кіт на шыбах, бабуся Палося кленчыла пад іконаю Маці Божай, благаючы яе аб мір на зямлі, а мы, малютá з усяе вуліцы, пазнавалі, з чыёй хаты герой пікуе ў тое падворышча, мала не чапіўшы коламі комін. Суседзі выбачалі ім гэта, бо не заўсёды зляталіся яны з-над Нямеччыны назад цэлай кампаніяй. Паступова абнаўляўся персанал не толькі ў выніку ваенных стратаў; закаханых, што наважыліся жаніцца з мясцовымі, пераводзілі ў аддаленыя палкі. Аднаму такому не дазволілі нават развітацца з гаспадынькай з Надрэчнай, дык ён усё роўна пакружыў буслам над яе сялібаю, накідаўшы ёй на аселіцу пакункаў з размаітым дарагім нямецкім барахлом і амерыканскімі прысмакамі з інтэндантуры.

Я без памяці любіў Сашу з Масквы! А ён — Тасю з Астроўка, кравецкую вучаніцу маёй маці. Карыстаючыся ягонай занятасцю дзяўчынай, я кранаў аўтамат пад сцяною, расшпільваў кабуру ў рамянях на вешалцы, разглядаў круглясты гадзіннік з фасфарызуючымі лічбамі, бяготкімі

стрэлкамі. Аднойчы схадзіў з ім да яго самалёта і пасядзеў у кабіне, што ўпаўнаважыла мяне, нарэшце, зрабіцца роўным з Шамрухамі.

На нястачу амуніцыі хеўра не наракала. Беспамылкова апазнавалі ленты з разрыўнымі і запальнымі вярхамі (сінія, чырвоныя). Цанілі проціпаветраныя патроны. Шарпалі адзін аднаму адзенне за першынства да намацанага ў зеллішчы ля разбітае гарматы снарада. Рвалі ў полымі, нанасіўшы на знаходку хворасту (так разнесла ў кавалкі Ляра і нашпігавала асколкамі большага Галяка, што пас кароў з Плянтанскай). Не ўдаваліся пакражы ў аэрадромных арсеналах, надта ж пільнавалі нейкія манголы. Страшныя: — Гранат в жоп, бэнзін в рот, огнь в жівот, будэт тэбэ взрыв, говно в нэбэса, вон дурак!

Заядла стругаў я з бярозавага палення разнатыпныя бамбавозы і знішчальнікі. Шавецкія нажы з бацькавага варштата рэзалі, як брытва! Ад гэтага захаплення лётніцтвам нашу познатак на левым калене — распаласаваў незнарокам цела да белае косці. Гэта мяне астудзіла і я пашукаў сабе супакаення на гарышчы з таямнічым трымценнем павуціння. Бескантрольна шныпарыў, да суполкі з катом Мурыкам (выпуджваў яму мышэй з-пад упыленых ламачавінаў). Маімі ж ласункамі лічыліся варэнні ў збанках, мёд у верцешчы, пахоткія антонаўкі ў куфэрку; у гэтым захаванку наткнуўся я на апетычныя, бы дзве цаглінкі халвы, кніжыскі. На вокладках серабрыстыя, што бабульчыны рублі, надпісы “Пушкин”, “Лермонтов”. Пагартаў, фатаграфіі паноў і паняў, грудзістых генералаў, цароў і царанятаў; вершы, нібы па-нашаму і не. Ажно жудасць браць, як жыдоўскія якія, абыходжаныя бокам у апустошанай бажніцы, следам за дарослымі (малаткамі абстуквалі сцены, ці не пачуецца глухі водгук рабінскага скарбу). Загадка прыцягвае. Варочаў я тыя фаліянты ад пачатку і ад канца, не зводзячы слыху з погаласаў жывёлы, цокату падковаў па бруку, вэрхалу ў задворках. Каб матка не заспела! Найсмачнейшае тое, што забароненае, — перажоўваў кабалістычныя мне

фразы, пранікаючыся неспасціглым аніяк значэннем іх. Учытваўся і ў надрукаваныя пісьмы вялікапанскага Аляксандра Сяргеевіча. Параўноўваючы да папіных — не знаходзіў пра галечу ў доме паэта, пра недасягальныя валёнкі на Каляду і прыжменькі пазычанае мукі на Вялікдзень... Дай Бог, ага, Яновічам санкт-пецярбургскія недаедкі! Вёска ў баярскіх песнях, як у Юр'еў дзень. І праца ў ёй гулянкаю. Калі я наважыўся дэкламаваць бацьку завучаныя тыя "сцішкі", ён быў паслухаў іх трохі, нарыхтоўваючы капылы дзеля новай пары, і нацягваючы паценгамі вярхі на іх натужліва адсек: "Што Пушкін твой знае пра жыццё? Ідзі во, лепш, памажы маме бульбы натаўчы свінням!" Перабраўся я з паэзіяй да бабусі, але яна засынала ад яе, апраўдваючыся: "А ці карысць якая людзям была ад таго Аляксандра?" Гнявіла іх мая чуласць на прыгажосць прыроды. Спатрэбілася паўжыцця ў вялікагарадскім асяроддзі, каб уцяміць сабе, чаму гэта так. Парынаючы носам за плугам, знемагаючыся ў касавіцу, поўзаючы па барознах у капанне бульбы, не знаходзячы сабе месца ад стомы пасля выездаў у завейны лес па дровы, намалаціўшыся ў два цапы на таку, — акружаючае можна было толькі перамагаць, упарта і бязлітасна, замест легкадумна мілаваць. Лірыка ў чалавеку запацелае да гаркаты на губах працы такая самая рэдкасць, як дабро ў катаржніка.

Дарэчы, на чытанкі не завельмі хапала свабаднейшых хвілінаў. З'яўляліся брацік за брацікам. Першы, Валодзік, памёр, так і не стаўшы на ножкі; худзенькае небажчаня пахавалі каля дзеда Паўла (клічучы карміцеля радзіны на абед, убачылі яго мёртвым на падарожным куфэрку, які збіў ён у сваёй сталяроўні майму будучаму бацьку, рэкруту ў сувальскі гарнізон).

Дзіця ўдачнае, у рэшце рэшт не хваруль, нарадзілася ў лютым сорак пятага. У сувязі з тым прыкра перагаварылі між сабою нявестка з цешчаю, якая настойвала на паўтор нядаўняга паніхіднага імя. У неладзе ўвайшоў я, прапануючы ахрысціць

немаўля Сашам, вядома, дэкларуючы ўзамен калыхаць яго штодзень. Маленькі неўзабаўку абрыд мне, ясная справа, Сашунчык стаўся Сашуном або і Сашуніскам.

Заклапочанасці прыбывала і са школаю, але гэта ўжо іншая гісторыя, на асобную аповесць. Мімаходзь згадваю пра яе таму, што адзін год навучалі ў ёй па-беларуску, пакуль па рынку паходжваў з пагонамі старшага лейтэнанта камендант горада, а выганы вакол Крынак заставілі фургонамі савецкай арміі, што варочалася з ваеннымі трафеямі цераз устаноўленую на шашы ў Гродна граніцу, зараз за прысадамі магістрацкага пісара Камароўскага і партыйнага арганізатара Анісімовіча, з якімі круціў іхны сусед Звярынскі, крамнік, АКоўскі падпольнік. Салдатня распрадавалася за бесцань; за паўбуханкі чорнага хлеба Патэж набыў фуражку і нашыў сабе на плечукі латанай кашулі маёрскія адзнакі; Ліс з Чаркесам шпанілі з адным на двух ручным гадзіннікам, статут карыстання якім абмяжоўваўся фактычна да нешматслоўнага артыкула: “Дай цяпер мне панасіць”. Як заўсёды, пераплюнулі хаўруснікаў Шамрухі, але яны не забаўляліся ў куплю, а падседжвалі нагледжанае ў саквояжах расспяваных ардэнаносцаў. Мелі ж прытым не абыякі аргумент, бутэльку самагонкі, якую гналі тады нават бабы. Нашы верхаводы заблішчэлі ў адзін адвячорак на Сакольскай — ад безлічы медалёў, ад барады па пуп, падпярэзаныя юхтовымі рамянямі з бляшанымі літарамі “Гот міт унс”, на якіх шапацелі парожнія і сухаватыя ад неначышчанасці кабуры. Ну, на сярэдзіну вуліцы яны не паказваліся, а ўсё хваліліся, пастаўшы за штыкетнікам, каб сябры не абабралі ў зайздрослівым натоўпіку. Упрошвалі іх. “За Сталіна прынясу я табе кашыска агуркоў!” — прынаджваў я і ў адказ глытаў слёзна ганьбу пабачыць перад носам рагатлівую дулю. Усё багацце спеючых загонаў ды сліваў з грушамі і яблынямі магло апынуцца ў іхным свіронку. Не ўступалі, што давяло да непрадбачанага нікім рэзультату: хеўра назаўсёды распалася. Зрэшты, спакваля выветрывалася з нас

дзіцячасць, заўчасна сталелі мы ў нежартоўных умовах пасляваення.

У апошні акорд прамінанню дзяцінства ўсплыў ва ўяўленне абразок з неспазнанымі мною жыдамі, якіх немцы вывозілі на сялянскіх вазах у Кілбасіну ля Нёмана. Да рушыўшага даўжэзнага абозу дабягаў ззаду старэча з мяшэчкам за плячыма, а паліцай паганяў яго кіем, шпарачы з-за вуха. Калі заганялі іх яшчэ ў гета, загароджанае глухім парканам з калючым дротам паверх, не хапіла ў мяне памяці, каб захаваць на век які-колечы твар. Шаўцы і штэпарнікі падлазілі начамі да іх абменьваць прадукты на падэшву і хром; вартавыя гарлапанілі "хальт!" і стралялі як чуццё ім падказвала. Цугуючаму ў ветраную пахмурнасць бацьку пацэлілі з паўкіламетра ад Касцельнае ў тоўсты гумовы абцас, ажно бразнуўся ён перадам на масток да Скроўбаў, што ўбудаваліся побач, над камяністаю Крынкаю. Ад свісцячага ўдару распухла яму пята, што было глупствам.

Ці марылі ў нас пра шчасце, не ведаю. Не даю рады ўспомніць. Нешта падобнае на гэта, несумненна, бадзялася ў людскіх сэрцах. Недалюблівалі палякаў яксьці па-феадальнаму, але разам з тым адчувалася, што з-за нерэальнасці стацца імі напраўду. Расіянства ж перастала захапляць па прычыне калхозаў, гальщьбы, Сібіры. А натруджанасць, акрамя як беларуская, не бывала. Тры стэрэатыпы, бы ў першабытнасць сваю посмак бруістага здрою, цвілое скарынкі, лыжкі заціркі.

У палове вёсен да маладосці — выйсця ў гарадскі пейзаж Беластока — паспытаў я пакрысе ўсякага светабачання: беларускага і расейскага, польскага і нямецкага, і з жыдоўскім судакрануўся; даляталі почуты пра крушынянскіх татараў. З калатнечы ў прысутнасць Нямеччыны ў нас не вынес набрынялых сінякоў. Акупацыйныя сполахі мільгалі па-за маёй свядомасцю, глядзеў я на іх абыякавым зрокам, што ёсць нармальнае ў малога. Калі чаго пужаўся, дык не сілаю пачуццяў, якіх у малалецтве няма, а інстынктам самазахавання. Дзіця існуе — пераважна — жыватом. Зрэдчас прачынаюцца ў

ім сантыменты, але ўсё роўна да чалавека яму яшчэ надта далёка. Пачынаеш быць ім у чатырнаццаць — шаснаццаць. У даспяванне. У першае каханне. Ад тых жа гадоў жыццяпіс не рвецца на секвенцыі, не балаганіцца выпадковым калейдаскопам.

KAMUNIKAT.org